**Бяляўская, Н.** Цяжка ў вучобе – лёгка ў баі / Н. Бяляўская // Родныя вытокі. — 2010. — 13 лют. — С. 1.

## ЦЯЖКА Ў ВУЧОБЕ – ЛЁГКА Ў БАІ



На сваіх плячах адчуў мудрасць народнай прымаўкі былы афганец Валерый Сяргеевіч Казачонак (на здымку). Пасля школы ды курсаў вадзіцеляў пры Докшыцкай аўташколе хлопец пайшоў на тэрміновую службу. Яшчэ ў Докшыцах ведаў, што накіроўваюць яго ў Афганістан. Ведаў і шмат часу трымаў гэта ў сакрэце, бо не хацелася трывожыць бацькоў. Сціпла ўсміхаецца і ўпэўнена гаворыць, што зрабіў правільна. У свае 18 з хвосцікам мудра разважаў, што не трэба пагаршаць і без таго не вельмі добрае здароўе маці, якая, бясспрэчна, будзе трывожыцца за сына. Доўгі час ішлі ад сына лісты «з Манголіі», з фотаздымка ласкава ўсміхаўся загарэлы сын у капелюшы замест армейскай фуражкі.

5 месяцаў у «вучэбцы» ў самай паўднёвай кропцы Савецкага Саюза пад назвай Кушка былі складанымі. Практычна, прайшло поўнае пераабучэнне дыпламаванага вадзіцеля. Баранку «КАМАЗа» хлопец навучыўся трымаць у аўташколе, там жа набыў пэўныя навыкі, але, каб ездзіць па горных дарогах, вазіць грузы ў ваенных умовах ды пры гэтым заставацца жывым, трэба было яшчэ доўга вучыцца і набываць пэўны вопыт. Апрача таго, салдату Савецкай Арміі неабходна было ўмець страляць і выконваць шматлікае іншае, каб не лічыцца, а быць абаронцам Айчыны.

За год і сем месяцаў скалясіў «КАМАЗам» Валерый Казачонак увесь Афганістан. У складзе 59-й брыгады матэрыяльнага забеспячэння 40-й арміі калона машын дастаўляла зброю ва ўсе падраздзяленні Савецкай Арміі, што знаходзіліся на афганскай тэрыторыі. Без суправаджэння разведчыкаў, сапёраў, танкаў і абароны з неба – верталёта – калона з месца не здымалася. І тыя самыя 300 кіламетраў праходзілі яны ў залежнасці ад абставін: то за тыдзень, а то і за два. За месяц больш за два рэйсы зрабіць не атрымлівалася.

– Канечне, было складана, – не сумняваюся я. – А ці было страшна?

– Пачуццё страху чалавеку ўласціва, – разважліва адказвае былы афганец, – але калі дазволіш яму запоўніць сябе, то чакаць станоўчага не прыйдзецца. Страх павінен прысутнічаць у межах разумнага, ён павінен падштурхнуць належным чынам абараніць сябе і тых, хто стаіць за табой.

Увогуле, зверху дадзена так, што доўг абаронцы ўскладзены на мужчыну і адступаць ад доўгу ганебна. А баяцца не трэба, бо хто ведае, што цябе чакае сёння ці заўтра, на вайне ці ў

дарозе? Вось мой саслужывец з Расіі ў Афганістане не атрымаў ніводнай драпіны, а дома трапіў пад колы матацыкла і стаў інвалідам другой групы.

– На вачах у Вас шмат загінупа байцоў?

– Ды не. За перыяд службы загінуў Сашка Гром з Брэсцкай вобласці. Памятаю гэты выпадак і зараз. З вялікай павагай успамінаецца камандзір 40-й арміі Громаў. Высокаадукаваны і мудры быў военачальнік. Кожны трагічны выпадак дэталёва разбіраўся, а за людскія страты трымалі справаздачы падначаленыя непасрэдна перад ім. Цану жыцця ведаў генерал. Менавіта і я зразумеў яе на вайне.

– Вайна... Партызанскі рух, хутчэй.

– І гэта праўда. Днём размаўляеш з афганцам і па сутнасці душы сваёй славянскай бачыш у ім сябра. А ноччу той «сябар» можа ўсунуць табе нож у спіну, адрэзаць вуха і атрымаць за гэта куш. Давялося бачыць таксама адносіны з боку састарэлых. Якраз, як па тэлебачанні паказваюць: сядзяць старыя ў белым убранні, як муміі, і здаецца, што нічога іх не хвалюе. А вось падбеглі да калоны дзеці (яны і афганскія, і славянскія аднолькавыя: ім усё цікава і многае трэба), мы пачаставалі іх. У гэты час падбягае стары, кідае хлапчанё на зямлю і топча яго нагамі. І гэта толькі за тое, што той падышоў да няверных. Вось тут і вера ва Усявышняга, і любоў да бліжняга.

– Сніцца па начах Афган?

– Рэдка. Звычайна пасля сустрэчы з воінамі-інтэрнацыяналістамі. Жыву звычайным жыццём, дзе большую частку займае работа (задавальняе, што любімая), сям'я: любая жанчына, сын і, канечне, родныя, сябры.

Валерый Сяргеевіч Казачонак спакойны, ураўнаважаны, сціплы і дасканалы ў сваёй справе. Электраманцер-вадзіцель аператыўна-выязной брыгады раёна электрычных сетак не страціў годных чалавечых якасцей на вайне, знайшоў сябе ў штодзённым жыцці і з годнасцю нясе сваё «Я».

**Н. Бяляўская**